исследований белорусской культуры, языка и литературы» Нац. акад. наук Беларуси. – Минск, 2012. – 31 с.

*7. Ильина, Е. В.* Предпосылки возможного определения понятия «Архитектурная школа» / Е. В. Ильина // Междунар. науч.-исслед. журнал. – 2013. – № 3 (10). – С. 123–126.

**К. А. Скур’ят,** *саіскальнік*
*вучонай ступені кандыдата навук*
*установы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў».*
Навуковы кіраўнік – **А. М. Нароўская,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны*
*ўстановы адукацыі*
*«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў»*

# РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ КУЛЬТУРЫ ТАТАР МУЗЕЯМІ БЕЛАРУСІ

Сучаснае беларускае грамадства адрозніваецца шэрагам сацыякультурных асаблівасцей, якія шмат у чым вызначаюць яго стан і тэндэнцыі развіцця. Вопыт міжнацыянальных і міжканфесійных зносін у межах беларускай дзяржавы сведчыць аб адсутнасці тут сутыкненняў на этнічнай, расавай і канфесійнай аснове.

Культуры нацыянальных меншасцей прадстаўлены ў шэрагу музеяў рэспублікі, яскрава гэта прасочваецца ў гісторыі татарскай абшчыны рэспублікі.

Татары на беларускіх землях пачалі сяліцца ў XIV ст. у выніку ўнутрыпалітычных канфліктаў у Залатой Ардзе. На рубяжы XIV і XV стст. некалі магутная Залатая Арда ў выніку бясконцых войнаў, дынастычных і родаплемянных спрэчак перажывала глыбокі крызіс.

У пачатку XVII ст. у Вялікім Княстве Літоўскім колькасць татар дасягала 100 тыс. Непасрэдна ў самой Беларусі колькасць татарскіх пасяленцаў, на думку даследчыка І. Б. Канапацкага, складала 20–25 тыс. чал. [5, с. 12]. Асноўнымі цэнтрамі іх рассялення былі Клецкі, Слуцкі, Навагрудскі, Мінскі, Лідскі,

Ашмянскі, Слонімскі, Троцкі паветы. Выбіралі месца для жыхарства татары як у сельскай мясцовасці, так і ў гарадах – звычайна асобнай грамадой на вуліцах-канцах, утвараючых прадмесці.

Першым даследчыкам гісторыі і культуры беларускіх татар быў Антон (Алі) Восіпавіч Мухлінскі (1808–1877). Яго праца «Даследаванне пра паходжанне і стан літоўскіх татар» спрыяла пачатку вывучэння беларускіх тэкстаў, напісаных арабскім пісьмом [7].

Сярод сучасных даследчыкаў гісторыі і культуры беларускіх татар вылучаюцца І. Б. Канапацкі, З. І. Канапацкая, А. І. Лакотка і інш. [4–6].

У экспазіцыях краязнаўчых музеяў (Клецк, Узда, Маладзечна), як правіла, тэма жыцця татар актыўна закранаецца ў матэрыялах, прысвечаных рэлігійнаму жыццю краю.

Яскравым прыкладам такой прэзентацыі татарскай культуры з'яўляецца экспазіцыя Мінскага абласнога краязнаўчага музея ў раздзеле, прысвечаным канфесіям мясцовага насельніцтва.

У экспазіцыі прадстаўлены хамаіл (малітвеннік) XIX ст., тасбіх і два мугіры. Звычайна ў хамаіле арабскія і турэцкія тэксты суправаджаюцца тлумачэннямі на беларускай або польскай мовах (арабскімі літарамі) [9].

Тасбіх (ружанец мусульманскі) – пацеркі, нанізаныя на шнурок, якія выкарыстоўваюцца для адліку прачытаных малітваў, выкананых паклонаў і г. д. Гэты ружанец складаецца з 99 акруглых пацерак і трох дадатковых прадаўгаватых, якія дзеляць ружанец на тры роўныя часткі (па колькасці ўхваленняў Алаха – «Слава Алаху», «Хвала Алаху», «Алах вялікі»).

Мухіры (мугіры) – дываны з выявамі вядомых мячэцей, палотны з тканымі ці вышыванымі радкамі тэкстаў Карана, імёнамі пракрокаў, сцягамі і сімваламі. Выкарыстоўваюцца для аздаблення сцен у мячэці.

У дзяржаўных музеях нашай краіны культура татар звычайна дэманструецца на часовых выстаўках, у якасці прыкладу можна прывесці праект Нацыянальнага гістарычнага музея «Зброя і гонар. Татары на службе ВКЛ», які праходзіў з 5 лютага па 3 красавіка 2016 г. у філіяле Нацыянальнага гістарычнага музея – Доме-музеі І з'езда РСДРП.

Нягледзячы на тое, што галоўнай тэмай выстаўкі з'яўлялася ваенная справа татар, на ёй былі прадстаўлены таксама

прадметы побыту і адзенне (жаночыя і мужчынскія касцюмы, упрыгожванні і да т. п.) [8].

Найбольш поўна, на думку аўтара, побыт і культура беларускіх татар раскрыта ў Іўеўскім музеі нацыянальных культур.

Па паданні татарская асада (паселішча) у Іўі з'явілася ў пачатку XV ст. як узнагарода татарам за ўдзел у Грунвальдскай бітве. Па даных рэвізіі Іўя, у 1561 г. там пражывалі 4 татарскія сям'і, якія займалі 6 дамоў. У 1597 г. у мястэчку налічвалася ўжо 13 татарскіх сем'яў. У нашы дні ў Іўі пражывае другая па велічыні татарская абшчына Рэспублікі Беларусь (каля 600 чал.) [2, с. 476].

Раздзел пастаяннай экспазіцыі музея «Беларускія татары» знаёміць з гісторыяй з'яўлення татар на беларускіх землях, іх рэлігіяй, свяшчэннымі кнігамі, прадметамі культу, побытам, святамі і грамадскай дзейнасцю. У цэнтры экспазіцыі – макет Іўеўскай драўлянай мячэці, самай старажытнай дзеючай мячэці ў Беларусі. Дзякуючы дэталёва адноўленаму макету наведвальнікі могуць азнаёміцца з яе аздабленнем і ўнутраным убраннем.

У экспазіцыі шмат унікальных экспанатаў: дакумент «Лягі» 1892 г. (пасведчанне аб заканчэнні школы пры мячэці); джуба (рытуальнае адзенне) імама; на сцяне – мугіры, вышытыя і намаляваныя мясцовай мастачкай Э. Х. Шабановіч, і чорна-белыя фотаздымкі, якія дэманструюць побыт татарскай дыяспары; падсвечнікі, акенца і мінарэт з Іўеўскай мячэці 1920-х гг. [1].

Цікавай знаходкай музея з'яўляецца раскрыццё тэмы нацыянальнай кухні. На сталах у экспазіцыі размяшчаюцца муляжы татарскіх страў.

Старшым навуковым супрацоўнікам музея Марынай Пятроўнай Пазняк для дзяцей школьнага ўзросту распрацавана інтэрактыўная тэматычная экскурсія па зале «Беларускія татары». Для лепшага засваення матэрыялу наведвальнікам прапануюць прыняць удзел у сюжэтна-ролевай гульні пра з'яўленне татар на тэрыторыі Беларусі, падчас якой абраныя ўдзельнікі будуць выконваць ролі вялікага князя Вітаўта, хана Залатой Арды Тахтамыша і хана Цімура. Знаёмства з рэлігіяй і традыцыямі таксама праходзіць у гульнявой форме. Да прыкладу, экскурсанты запамінаюць змесціва кошыка з садагай – прысмакамі, якімі ў першую пятніцу месяца частуюць адзін

аднаго ўдзельнікі намазу, або збіраюць рэцэпт гальмы, традыцыйных татарскіх прысмакаў. Спачатку ігракам неабходна выбраць з прапанаваных інгрэдыентаў неабходныя для вырабу гальмы, а затым даведацца пра рэцэпт гэтай стравы.

Па папярэдняй дамове для наведвальнікаў праводзіцца тэатралізаваная аглядная экскурсія «Іўе скрозь прызму стагоддзяў». Для дарослых супрацоўнікамі музея разыгрываецца невялікі спектакль аб тым, як з'явіліся татары-мусульмане на тэрыторыі Беларусі. Акрамя экскурсіі, на базе музея праходзяць лекцыйна-пазнавальныя праграмы з наведваннем помнікаў архітэктуры, у тым ліку Іўеўскай драўлянай мячэці.

У 2019 г. у Саборнай мячэці Мінска быў адкрыты першы на тэрыторыі Беларусі музей ісламу. Саборная мячэць мае выключнае значэнне для татарскай абшчыны Беларусі. З'явіўшаяся ў 1900 г. на месцы драўлянай мячэці XVI ст., яна была першым культавым збудаваннем беларускіх мусульман, зробленым з каменя.

Значная частка музейнай экспазіцыі адлюстроўвае гісторыю беларускіх татар, у яе ўвайшлі прадметы, сабраныя як у Беларусі, так і за яе межамі. Сярод экспанатаў – Караны і кітабы, што належалі беларускім мусульманам, гербы татарскіх шляхецкіх родаў, адзенне імама XIX ст. [3].

Такім чынам, татары Беларусі маюць багатую гісторыю, па сённяшні час выклікаючую інтарэс даследчыкаў. У музеях Беларусі захоўваюцца рэчы, звязаныя з татарскай культурай. У асноўным яны прадстаўлены прадметамі рэлігійнай і ваеннай тэматыкі і экспануюцца музеямі ў раздзелах экспазіцый, прысвечаных гісторыі рэлігіі, і на часовых выстаўках. Найбольш поўна культура беларускіх татар адлюстравана ў Іўеўскім музеі нацыянальных культур. Экспазіцыйна-выставачная дзейнасць беларускіх музеяў спрыяе абуджэнню інтарэсу да матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускіх татар, выхаванню пачуцця талерантнасці да іншых народаў, захаванню і развіццю міжнацыянальных і міжканфесіянальных зносін.

*1.* Белорусские татары [Электронный ресурс] // Ивьевский музей национальных культур. – Режим доступа: https://ivye-museum.by/belorus-skie-tatary/. – Дата доступа: 02.06.2022.

*2. Белявина, В. Н.* Татары / В. Н. Белявина // Кто живет в Беларуси / А. Вл. Гурко [и др.] ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы. – Минск, 2012. – С. 466–525.

*3.* В Минской соборной мечети открыли Музей ислама [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://minsk.gov.by/ru/news/new/2019/12/06/2829/. – Дата доступа: 06.12.2019.

*4. Канапацкая, З. І.* Фарміраванне татарскіх паселішчаў на тэрыторыі Беларусі ў XIV–XVII стст. / З. І. Канапацкая // Вес. Беларус. дзярж. пед. ун-та. – 2005. – № 1. – С. 29–33.

*5. Канапацкі, І. Б.* Беларускія татары. Гістарычны лёс народа і культуры / І. Б. Канапацкі // Мы з Іманам жывём на зямлі Беларусі: беларускі татарын Якуб Якубоўскі / уклад.: І. П. Драўніцкі, Т. В. Якубоўская. – Мінск, 2015. – С. 11–16.

*6. Лакотка, А. І.* Бераг вандраванняў, ці Адкуль у Беларусі мячэці / А. І. Лакотка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 97 с.

*7. Мухлинский, А. О.* Исследование о происхождении и состоянии литовских татар / А. О. Мухлинский. – Репр. воспр. изд. орд. проф. турецкой словесности А. О. Мухлинского. – СПб. : изд. в Типографии Э. Веймара, 1857. – Минск : Адраджэнне, 1993. – 70 с.

*8.* «Оружие и честь. Татары на службе ВКЛ» [Электронный ресурс] // Сайт УГЗ МЧС Беларуси. – Режим доступа: https://ucp.by/university/news/novosti-universiteta/oruzhie-i-chest-tatary-na-sluzhbe-vkl/. – Дата доступа: 01.03.2016.

*9.* Постоянная экспозиция «История Минщины с древнейших времен до начала XX в.» [Электронный ресурс] // ГУ «Минский областной краеведческий музей». – Режим доступа: http://molodechno mokm. museum.by/node/46288. – Дата доступа: 06.05.2022.